Бібліятэка Мінскага гарадскога аддзялення
Саюза пісьменнікаў Беларусі

Кацярына Роўда

# Паэтычныя КаРункі

Вершы



МІНСК
ВЫДАВЕЦТВА «ЧАТЫРЫ ЧВЭРЦІ»
2019

УДК 821.161.1(476)-31
ББК 84(4Беи=Рус)6-44
Р58

*Серыя заснавана ў 2011 годзе*

**Рэдакцыйны савет:**
*Міхась Пазнякоў (старшыня), Ліліяна Анцух, Уладзімір Гніламёдаў, Анатоль Аўруцін, Казімір Камейша, Уладзімір Карызна, Наталія Касцючэнка, Алесь Марціновіч, Васіль Шырко*

**Галоўны рэдактар серыі**
*Міхась Пазнякоў*

**Роўда, К. С.**
Р58 Паэтычныя КаРункі : вершы / Кацярына Роўда. — Мінск : Чатыры чвэрці, 2019. — 132 с. — (Бібліятэка Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі).
ISBN 978-985-581-290-7.

Зборнік «Паэтычныя КаРункі» — вынік творчых пошукаў і набыткаў таленавітай паэтэсы, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Кацярыны Роўда. У яго ўвайшлі вершы, напісаныя ў 2016–2018 гадах.

Кніга складаецца з двух раздзелаў: беларускамоўнага і рускамоўнага.

Адрасавана шырокаму колу чытачоў, якіх цікавіць любоўная, пейзажная, грамадзянская і філасофская лірыка.

**УДК 821.161.1(476)-31**
**ББК 84(4Беи=Рус)6-44**

**ISBN 978-985-581-290-7**

© Роўда К. С., 2019
© Афармленне. ТДА «Выдавецтва “Чатыры чвэрці”», 2019

# Чорным па белым



* * *

Вады —
Халоднай,
Калодзежнай,
Чыстай.

Кахання —
Надзейнага,
Чулага,
Смелага.

Веры —
Глыбокай,
Шчырай,
Празрыстай.

Настрою —
Добрага,
Светлага,
Белага.

Вершаў —
Крылатых,
Дастойных,
Пафасных.

Сябра —
Здаровага,
Вернага,
Годнага.

Думак —
Прыгожых,
Чароўных,
Радасных.

Мужа —
Адзінага,
Мілага,
Роднага.

* * *

Халодны горад, несупынны бег,
Аўтобусы, тралейбусы, трамваі.
А я хачу туды, дзе чысты снег,
Няхай сабе, як сёлета, у маі.

Дарогі, пешаходы, гул машын,
На сцежках — соль або пясочак рыжы,
У кубку — кава, побач — аспірын.
А я хачу гарбаты і… на лыжы.

У крамах — чэргі, мітусня кругом.
Жыццё ў сталіцы — прывіднае шчасце.
А я хачу заснуць салодкім сном
Пад цёплай коўдрай у бацькоўскай хаце.

Замерзлі рукі, хітрыя ключы
Схаваліся, здаецца, у кватэры.
А я хачу сягоння ў Савічы́,
Туды, дзе незачыненыя дзверы.

# Чорным па белым

Срэбны месяца серп выразаў мае кветачкі-сны,
Што былі каляровымі, смачнымі, лёгкімі, смелымі.
Я шукала карэнне сваёй бесклапотнай вясны,
Аздабляла дванаццатым шрыфтам, чорным па белым…

Я стварыла галактыку ста вершаваных планет,
Што не больш чым пылінка сярод паэтычнага космасу.
Праглыне або прыме мяне гэты творчы сусвет —
Справа веры маёй, працаздольнасці, шчырасці, хронасу…

Забірай мае сны, цёмнай ночы нязменны баец.
Зоркі з неба здымі і аддай медзякамі збяднеламу.
Вострым рогам на сэрцы маім ты пакінеш рубец —
Не спынюся выводзіць па літарцы… чорным па белым…

Адпушчу свае думкі… Няхай матылькамі ляцяць,
Абуджаючы душы… Няхай не заўжды і не ў кожным…
І, магчыма, калісьці і я навучуся пісаць…
Толькі трохі па-іншаму — белым выводзіць па чорным.

* * *

Дайце крэйду, і я намалюю,
Як па небе плывуць аблачынкі,
Хлапчука ў вышыванай кашулі,
Ля яго — прыгажуню-дзяўчынку,

Дыск пяшчотнага летняга сонца,
І нязжатае спелае жыта,
І бацькоўскае хаты аконца,
Двух буслоў у пяшчоце блакіту.

Намалюю букецік язміну
Для любімай бабулі Рынечкі,
Наш падворак, кароўку Каліну,
Сена стог і імклівую рэчку,

Што прыгожаю стужкаю ўецца
Па любімым валожынскім краі,
І сваё апантанае сэрца,
Што ў дзяцінства нязменна вяртае.

Намалюю садок я і школу,
Што ўздымаліся велічна, важна…
Ды, схінуўшыся ў скрусе да долу,
Прашапчу: «Божа мілы, як страшна!..»

Ні бабулі, ні саду, ні школы,
Пустазелле расце замест жыта,
Абеліск — сірата, а наўкола
Цішынёю прастора абвіта.

Ліхтары пры дарозе паснулі
Ад тугі па мінулых часінах,
І сумуюць, сівеюць матулі
У сваіх адзінокіх хацінах.

Дайце крэйду, і я намалюю
Да куточка радзімага сцежкі,
Тых, каго толькі ў думках цалую,
А на зморaных тварах — усмешкі.

Слёз няма. А на сэрцы — шклавата.
Малявала… А мне б памаліцца.
Вінавата. І я вінавата,
Што ўцякла з роднай вёскі ў сталіцу.



* * *

Галасы былых сяброў
Чую ў снах пафарбаваных.
Сто гарэзлівых вятроў,
Намі, смелымі, дагнаных,

Там, за полем, за ляском,
Прытаіліся. Цікуюць.
Я іх клічу зноў і зноў,
А яны са мной жартуюць.

Рэкі памяці душу
Успамінамі кранаюць.
Я іх век не асушу,
Хай да скону калыхаюць

Сэрца ў водах цеплыні.
Не забыць усмешак весніх,
Што, як сонца прамяні,
Змрочны дзень рабілі песняй.

Мне б і сёння напяваць
Тыя светлыя матывы,
Мне б вас, родныя, абняць,
Прыпыніць бы час руплівы…

Пасля доўгіх вечароў,
Мітуснёю знітаваных,
Галасы былых сяброў
Чую ў снах пафарбаваных.

* * *

Зарастае лясок. Дзе грыбы? Дзе суніцы?
Непралазны гушчар. Дзе-нідзе — зверабой.
Я збіраю яго, нібы сэрца крупіцы,
Каб Радзімы цяплом прычасціцца зімой.

Абдымае вятрыска, самотныя травы
Напяваюць дзяцінства нязменны матыў.
І ўцякаюць гады, як гарачая кава
Па фарфоравым кубку, каб той не астыў.

Застаюцца сляды — тых гадоў успаміны
Пра юнацтва, шматзорныя ночы без сну,
Пра лясок, дзе чакалі сястрычкі-асіны,
І каханне, якое хмяліла вясну.

Я павольна іду па расквечаным полі
І збіраю валошкі — усмешкі нябёс.
Родны край, дай Гасподзь табе лепшае долі,
Без пустуючых хат і пакутлівых слёз.

# Змест

**ЧОРНЫМ ПА БЕЛЫМ**


«Вады…» . . . 4
«Халодны горад, несупынны бег…» . . . 5
Чорным па белым . . . 6
«Дайце крэйду, і я намалюю…» . . . 7
Галасы былых сяброў…» . . . 9
«Зарастае лясок. Дзе грыбы? Дзе суніцы?..» . . . 10
«У роднай хаце пахне пірагамі…» . . . 11
Сад . . . 13
Туды . . . 14
«На аркушы белым — прыгожыя кветкі…» . . . 15
«Я запомніла ўсё: і чароўныя вочы…» . . . 16
«На радкі я нанізваю пацеркі-словы…» . . . 17
«Апячы мае вусны сваім пацалункам…» . . . 18
«Запалі яе сэрца, нібыта лучыну…» . . . 19
«Прыкладаю да сэрца крываўнік…» . . . 20
«Бачыш, імклівыя кроплі пікіруюць на падаконнік…» . . . 21
Двое . . . 22
«Ускраек лета. Жнівеньская ночка…» . . . 23
«Наталяюся! Прагну! Малюся!..» . . . 24
«Я табою была апалена…» . . . 25
«Дзясятая вясна…» . . . 26
«Адбітак вуснаў на пустым фужэры…» . . . 27
«Не знікну я пад ветразем ігнору…» . . . 28
«Рві сэрца! Пакідай! Страляй у грудзі!..» . . . 29
«Півоняй майскай твар твой ружавее…» . . . 30
«Лісце клёну — сляды маляўнічага лета…» . . . 31
«Зарыпела падмерзлае лісце…» . . . 32
«Бывай. І больш пяшчоты не прасі…» . . . 33
«Абдымала так шчыра ноч…» . . . 34
«Гарэлі вусны агнём…» . . . 35
«Насустрач ветру…» . . . 36
«Забалела ў грудзях, не вытрымваюць скроні…» . . . 37
«А ты не плач, спалі драўляны страх…» . . . 38
«А я развешваю па сценах цішыню…» . . . 39
«На шчацэ застылі слёзы-дыяменты…» . . . 40
Дарослая маленькая дзяўчынка . . . 41
«Чысты аркуш вазьму і не твой намалюю партрэт…» . . . 42
«Душа прытулак адшукала…» . . . 43
«Вусны смаку маліны…» . . . 44

«Адзінота горкая, як палын…» . . . 45
«Павуцінка крывавая, белы снег…» . . . 46
«Саманадзейна, бы снягір на правады…» . . . 47
«Будзь чалавекам — проста памаўчы…» . . . 48
«Не снежна…» . . . 49
«Мы рушым, падаецца, не туды…» . . . 50
«Недаспелых пачуццяў зялёнае збожжа…» . . . 51
«Так блізка, так горача…» . . . 52
«Што ж табе так смешна з гасціннай шчырасці?..» . . . 53
«У жоўта-зялёны колер фарбуеш старанна хату…» . . . 54
«Хочаш прыйсці? — Прыходзь…» . . . 55
«Не дашаптаў. Перакрычала…» . . . 56
«Душа — пакой… без вокнаў і шпалераў…» . . . 57
«Звіняць званы, трывожныя званы…» . . . 58
«Беларусь! Расія! Украіна!..» . . . 59
Зайздросніку . . . 60
«Валяўся верш у сшытку, бы памерлы…» . . . 61
«Вы ведалі гэта? Вы гэта ці чулі?..» . . . 62
«Ні страфы, ні радка, ні слова…» . . . 63
«Ціхутка, таямніча і нясмела…» . . . 64
«Промні сонца цалуюць зямліцу…» . . . 65
«А я табе жадаю толькі шчасця!..» . . . 66

**КАСАЯСЬ КРАЕШКА ЛУНЫ**

«Бродить в ночи по раскалённым звёздам…» . . . 68
«Дай мне, Бог, научиться любить…» . . . 69
«Пока я здесь слагаю эти строфы…» . . . 70
«Книги… Они ведь, по сути, планеты…» . . . 71
«В бурную реку, себя не ругая…» . . . 72
«Травы, давайте споём о былом…» . . . 73
«Жемчугом дождик стучал в подоконник…» . . . 74
«Пишу стихи. Но разве я поэт?..» . . . 75
«Подожди. Обернись…» . . . 76
«Каждый вздох — как души изъятие…» . . . 77
«А Бог живёт не только в стенах храма…» . . . 78
«Чем ближе день, когда тебя не стало…» . . . 79
«Как много слов в благословенной тишине…» . . . 80
«Знаешь, ликует моя душа…» . . . 81
«В платье цвета облепихи…» . . . 83
«Удаляем из памяти сотни лиц…» . . . 85
«Под маской клоуна не всегда счастливый взгляд…» . . . 86
«Я хочу на тебя… смотреть!..» . . . 87

«Прошепчу еле слышно сухое “привет”...» . . . 88
«Задохнусь, цепляясь за стены ночи...» . . . 89
«Сердце, а можно чуть меньше чуткости?..» . . . 90
«Сколько раз я себе обещала, что буду молчать...» . . . 91
«Километры грусти...» . . . 92
«За окошком — просто сказка...» . . . 93
«Лицо из прошлого не то. Не то и тело...» . . . 94
«Травили душу слёзы невозможности...» . . . 95
«Ты хочешь сказать, что какой-то особенной фразой...» . . . 96
«Спокойной ночи, милый друг!..» . . . 97
«Ты приходи ко мне из сна...» . . . 98
Верь и помни . . . 99
Горели дни . . . 100
«Тогда ты мне казался Богом...» . . . 101
«Пролистав пять страничек романа...» . . . 102
«С неба на землю — слёзы дождя...» . . . 103
«Дотронуться — не значит удержать...» . . . 104
«Мне кажется, это не сон...» . . . 105
«Я счастливее вас, напролом я не лезу к вершинам...» . . . 106
«А знаешь, я, пожалуй, промолчу...» . . . 107
«Разбитый экран телефона...» . . . 108
«Тоска стекала по серым стенам...» . . . 109
«Его глаза кричали громче уст...» . . . 110
Я рядом . . . 111
«Не разлюблю дожди, и поезда...» . . . 112
«Два облака в манящей синеве...» . . . 113
«Укутаться в одеяло...» . . . 114
«Лениво солнце светит за окошком...» . . . 115
«Пришла пора размеренно дышать...» . . . 116
«Держи меня сильней. Не уходи...» . . . 117
«Валокордин, пустырник, корвалол...» . . . 118
«На белых щеках — дождливо...» . . . 119
«Слышишь... Ты никогда не уйдёшь...» . . . 120
Почисти души “инстаграм”...» . . . 121
«Разрешаю себе отказаться от бурь повседневности...» . . . 122
«А ты удались из ВК и Фейсбука...» . . . 123
«Переход. Ты стоишь на коленях...» . . . 124
Метро . . . 125
«А хочется улыбнуться, и чтоб в глазах...» . . . 126
«Всё не так... Не с теми, не там, не то...» . . . 127
«Немного холодно. Листва теряет вид...» . . . 128